УДК 631.51.01:633.63

Г. Д. БЯЛОЎ, М. І. ГУЛЯКА

(17)

ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД СПОСАБАЎ АСНОЎНАЙ АПРАЦОЎКІ ГЛЕБЫ ПАД ПАПЯРЭДНЮЮ КУЛЬТУРУ

Цукровыя буракі як караняплодная расліна патрабуюць наяўнасці дастаткова глыбокага і добра акультуранага ворнага пласта глебы. На мелкаўзараных ушчыльненых глебах вырастаюць караняплоды няправільнай формы, часта галінастыя, што пагоршвае іх якасць і павялічвае страты пры ўборцы. Дваццацігадовымі даследаваннямі Ганусаўскай доследна-селекцыйнай станцыі ўстаноўлена, што на дзярнова-падзолістых лёгкасуглінкавых і супясчаных глебах, якія падсцілаюцца лёгкімі пародамі, паглыбленне ўзворвання ад 20—22 да 25—30 см неэфектыўнае [1]. Для цукровых буракоў першачарговым мерапрыемствам з'яўляецца не павелічэнне глыбіні ворнага пласта глебы, а яго акультурванне.

Сістэма рознаглыбіннай апрацоўкі глебы ў севазвароце прадугледжвае ўжыванне паверхневай апрацоўкі пад збожжавыя і папаразаймальныя культуры. Пад прапашныя ж, у прыватнасці пад цукровыя буракі, рэкамендуецца праводзіць ўзворванне. Звязана гэта галоўным чынам з тым, каб добра загарнуць у глебу арганічныя ўгнаенні і стварыць дастаткова глыбокі рыхлы пласт глебы, неабходны для нармальнага росту і развіцця караняплодаў. Мэтай нашых даследаванняў з'явілася вывучэнне ўплыву паслядзеяння бясплужнай апрацоўкі на прадукцыйнасць цук-

ровых буракоў, іх тэхналагічныя якасці і аграфізічныя ўласцівасці глебы. Для ўмоў Беларусі такіх даных няма.

Даследаванні праводзіліся на Беларускай занальнай доследнай станцыі па цукровых бураках (Нясвіж) у стацыянарным палявым доследзе. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая супясчаная, развіваецца на валунным храсткападобным пяску, які з глыбіні 70—80 см падсцілаецца пяском. Магутнасць ворнага гарызонта 20—22 см. Асноўныя аграхімічныя паказчыкі ворнага пласта наступныя: pH_{KCl} 6,0—6,3, колькасць гумусу —2,4—2,6%, рухомых формаў фосфару — 25, калію — 21—23 мг/100 г глебы, сума паглынутых асноў — 9,1 мэкв/100 г глебы, ступень насычанасці асновамі — 87—88%.

Даследаванні праводзілі ў звяне севазвароту з наступным чаргаваннем культур: азімае жыта на збожжа — цукровыя буракі — ячмень. Паўторнасць трохразовая, размяшчэнне дзялянак рэндамізаванае, агульная плошча дзялянкі 125 м², уліковай — 88 м². Вырошчвалі цукровыя буракі сорту Ганусаўскія аднанасенныя 55, норма высявання — 18—20 клубочкаў на адзін пагонны метр. Угнаенні ўносілі з разліку $N_{120}P_{90}K_{150}$, гной—100 т/га, борную кіслату — 6 кг/га. Для барацьбы з аднагадовым двухдольным пустазеллем перад сяўбой буракоў уносілі гексілур з разліку 1,5 кг/га. Акрамя таго, для больш поўнага знішчэння ўсходаў пустазелля на пяты дзень пасля сяўбы буракоў праводзілася даўсходавае баранаванне. На працягу лета рабілі чатыры-пяць міжрадковых рыхленняў, Пры з'яўленні на ўсходах буракоў лічынак матавага трупаеда ўносілі метафос з разліку 1 кг/га. Пад цукровыя буракі на ўсіх варыянтах рабілася ўзворванне на глыбіню 20—22 см. Пад папярэднік буракоў — азімае жыта на збожжа асноўная апрацоўка глебы праводзілася па наступнай схеме: 1) узворванне ПЛН-5-35 на глыбіню 20—22 см (кантроль); 2) дыскаванне БДТ-7 на глыбіню 8—10 см; 3) адвальнае лушчэнне ПЛН-5-35 на глыбіню 10—12 см; 4) чызеляванне КЧ-5,1 на глыбіню 18—20 см.

Метэаралагічныя ўмовы ў гады правядзення даследаванняў па колькасці атмасферных ападкаў і тэмпературным рэжыме ў асноўным былі спрыяльнымі для росту і развіцця цукровых буракоў, акрамя 1988 г., які характарызуецца дэфіцытам вільгаці ў жніўні, у выніку чаго пачалося моцнае завяданне бацвіння, а лішак атмасферных ападкаў у верасні выклікаў інтэнсіўнае нарастанне маладога лісця і адток цукраў з караняплодаў, а значыць, і зніжэнне цукрыстасці.

Вынікі трохгадовых даследаванняў паказалі, што паслядзеянне бясплужнай апрацоўкі глебы не зрабіла ўплыву на гушчыню ўсходаў цукровых буракоў (табл. 1). На ўсіх варыянтах яна была практычна аднолькавай — 16 раслін буракоў на адным пагонным метры.

На варыянтах з бясплужнай апрацоўкай глебы пад папярэднік буракі развіваліся лепш, чым па ўзворванні. На момант прарывання маса 100 раслін буракоў на варыянце з дыскаваннем, адвальным лушчэннем і чызеляваннем перавышала кантроль на 0,8—4,6 г.

Табліца 1. **Уплыў паслядзеяння бясплужнай апрацоўкі глебы на гушчыню ўсходаў цукровых буракоў, масу 100 раслін і ступень пашкоджання караняедам (сярэдняе за 1986—1988 гг.)**

Спосаб апрацоўкі глебы пад папярэднік*	Гушчыня ўсходаў буракоў, шт/паг. м	Маса 100 раслін буракоў, г	Ступень пашкоджання караняедам, %
1. Узворванне на глыбіню 20—22 см	16	40,7	18,4
2. Дыскаванне на глыбіню 8—10 см	16	42,0	15,5
3. Адвальнае лушчэнне на глыбіню 10—12 см	16	41,5	13,9
4. Чызеляванне на глыбіню 18—20 см	16	45,3	13,3

* Варыянты апрацоўкі глебы аднолькавыя для табл. 1—5.